*У артыкуле разглядаецца актуальная праблема развіцця крытычнага мыслення падлеткаў, аналізуецца падлеткавы ўзрост як перыяд, які з'яўляецца сензітыўным у адносінах да вырашэння праблемы развіцця крытычнага мыслення. Прыведзены фактары, якія стымулююць інтэнсіўнае ўдасканаленне крытычнага мыслення падлеткаў. Разгледжаны асаблівасці засваення падлеткамі навуковых паняццяў, карыстання імі ў працэсе рашэння задач. Прадстаўлены вынікі даследавання, накіраванага на вывучэнне асаблівасцей развіцця ў падлеткаў крытычнага мыслення, сродкаў арганізацыі гэтага працэсу.*

# ВУЧЫЦЬ МЫСЛІЦЬ КРЫТЫЧНА – АКТУАЛЬНАЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ ЗАДАЧА

## Развіццё крытычнага мыслення падлеткаў на ўроках беларускай літаратуры



**В. Г. Ігнатовіч,**
загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковага навучання БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук



**В. А. Сідаровіч,**
выкладчык-стажор кафедры педагогікі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта

### Крытычнае мысленне ў навуковай літаратуры

Прадстаўнікі гуманітарных навук перакананы, што крытычнае мысленне з'яўляецца эфектыўным сродкам гуманізацыі і дэмакратызацыі грамадства, бо яно валодае асобаснай, сацыяльнай, прафесіянальнай значнасцю. На аснове сінтэзу падыходаў да праблемы крытычнага мыслення ў даследаваннях айчынных і замежных вучоных мы разглядаем яго як мысленне самастойнае, рэфлексіўнае, ацэначнае, сацыяльнае, мэтанакіраванае, аргументаванае, адкрытае, якое не прымае догмаў, развіваецца шляхам накладання новай інфармацыі на асабісты жыццёвы вопыт чалавека. *Крытычна мысліць* – гэта значыць праяўляць пэўную цікавасць да чаго-небудзь ці каго-небудзь; ставіць перад сабой пытанні і ўмець шукаць адказы на іх; умець выкарыстоўваць даследчыя метады; умець вызначаць прычыны і наступствы пэўных абставін; выпрацоўваць уласны погляд і здольнасць адстаяць яго пры дапамозе адпаведных доказаў; умець асэнсаваць аргументы апанента.

Агульнаметадалагічным пытанням развіцця мыслення прысвечаны навуковыя даследаванні філосафаў (М. С. Каган, Л. Н. Коган, А. Ф. Лосеў і інш.), педагогаў (П. П. Блонскі, П. Ф. Капцераў і інш.), псіхолагаў (А. С. Анісімаў, Л. С. Выгоцкі і інш.). Вучонымі вылучаны розныя аспекты такой якасці мыслення, як крытычнасць (З. І. Калмыкава, Н. А. Мянчынская, С. Л. Рубінштэйн). Значнасць крытычнага мыслення як актуальнай адукацыйнай праблемы абгрунтавалі Р. Паўль, Д. Клустэр, Д. Халперн.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры разгледжаны асобныя аспекты фарміравання крытычнага мыслення: удасканаленне арганізацыі і метадаў вучэбнага працэсу (А. Д. Абакумаў, І. Г. Агапаў), узаемасувязь крытычнага мыслення і талерантнасці (В. А Папкоў, Е. Л. Разанава), крытычны стыль мыслення (М. А. Тарасава), лагічнае мысленне (В. С. Ягорына), мэтанакіраванае развіццё інтэлектуальных уменняў (М. А. Халодная). Метадычны аспект фарміравання крытычнага мыслення раскрылі А. В. Бутэнка, І. В. Муштавінская, А. І. Ліпкіна, Л. А. Рыбак, Н. Г. Суворава, С. І. Векслер. Асаблівасці фарміравання крытычнага мыслення ў малодшых школьнікаў выявілі А. С. Байрамаў, Т. Ю. Капылава, В. М. Сінелькоў, праблеме развіцця крытычнага мыслення ў падлеткавым узросце прысвечаны даследаванні Г. І. Бізенкова, С. І. Векслера, А. І. Ліпкінай, Л. А. Рыбака. Спецыфіка развіцця крытычнага мыслення студэнтаў апісана

А. В. Бутэнка, А. Ф. Керымавым. Асветлены вучонымі і педагогамі пытанні фарміравання рэфлексіўнага мыслення (Дж. Дзьюі), псіхалагічныя і лагічныя аспекты рэфлексіі і творчасці (Н. Г. Аляксееў, Г. Г. Гарантаў, В. Г. Рындак, П. М. Якабсан).

Па пытанні першых праяўленняў крытычнага мыслення ў дзяцей у псіхолагаў не існуе адзінага меркавання. Некаторыя даследчыкі адносяць зараджэнне крытычнага мыслення да пачатковага школьнага ўзросту, другія лічаць, што крытычнае мысленне мае месца яшчэ ў дашкольным перыядзе развіцця дзіцяці.

## Асаблівасці мыслення падлеткаў

Па меркаванні В. Штэрна, крытычнасць у дзяцей абумоўлена наяўнасцю ў іх свядомасці пэўных устойлівых, дадзеных ад нараджэння норм, крытэрыяў. Крытычнае мысленне развіваецца ад негатыўнага да пазітыўнага крытычнага падыходу і праходзіць тры стадыі: спачатку крытычнасць у дзяцей праяўляецца ва ўгадванні асобных недахопаў, памылак, пасля яны спрабуюць раскрыць прычыны гэтых недахопаў і памылак, а затым пачынаюць рабіць некаторыя выпраўленні, замяняюць памылковы змест правільным [9].

У працэсе антагенезу адбываецца станаўленне і ўдасканаленне крытычнага мыслення, а падлеткавы ўзрост з'яўляецца сензітыўным для вырашэння праблемы развіцця крытычнага мыслення, бо для падлетка характэрна схільнасць да аналізу абстрактных ідэй, да інтэлектуальнай ініцыятывы; імкненне да пошуку альтэрнатыў, пазнавальнай самастойнасці; здольнасць аперыраваць гіпотэзамі.

Станаўленне ў падлеткавым узросце светапогляду і развіццё самасвядомасці стымулюе інтэнсіўнае ўдасканаленне крытычнага мыслення, аб'ектам якога становяцца думкі, пачуцці, якасці асобы, грамадскія каштоўнасці. Імкненне падлеткаў да крытычнасці ярка выражана, аднак недахоп ведаў, няўменне прымяняць веды на практыцы прыводзяць да крытыканства. Сацыяльная задача педагога – накіраваць падлеткаў на інтэлектуальны пошук і праяўленне творчай ініцыятывы, тым самым развіваючы крытычнае мысленне.

Падлеткавы ўзрост характарызуецца змяненнямі ўмоў, якія ўплываюць на асабістае развіццё дзіцяці. Яны датычацца фізіялогіі арганізма, адносін, якія складваюцца з дарослымі людзьмі і аднагодкамі, узроўню развіцця пазнавальных працэсаў, інтэлекту і здольнасцей. У падлеткаў з'яўляецца ўстойлівае імкненне да незалежнасці. Вядучы від дзейнасці – зносіны з аднагодкамі, накіраваныя на ўсталяванне эмацыянальных кантактаў з мэтай задавальнення інфармацыйных, эмацыянальных і іншых патрэб, якія не могуць быць задаволены падчас узаемадзеяння з дарослымі. Галоўныя матывацыйныя напрамкі гэтага ўзроставага перыяду, звязаныя з актыўным імкненнем да асабістага самаўдасканалення, – самапазнанне, самавыражэнне і самасцвярджэнне.

Падлеткавы ўзрост – перыяд нараджэння «генетычна-дэдуктыўнага» мыслення, здольнасці абстрагаваць паняцці ад рэчаіснасці, фармуляваць і правяраць альтэрнатыўныя гіпотэзы, рабіць прадметам аналізу ўласную думку. Да канца дадзенага ўзроставага перыяду чалавек ужо здольны аддзяляць лагічныя аперацыі ад тых аб'ектаў, над якімі яны праводзяцца, але падлеткі неаднолькава прымяняюць гэту здольнасць да розных аспектаў рэчаіснасці [7, с. 148]. П. П. Блонскі называе падлеткавы ўзрост перыядам спрэчак крытыцызму [1, с. 149]. Спецыфічная сацыяльная актыўнасць падлеткаў заключаецца «ў большай успрымальнасці да засваення грамадскіх нормаў, каштоўнасцей, у структураванні іх самасвядомасці і самавызначэнні пазіцый «Я і грамадства», «Я ў грамадстве». Пры гэтым вучэбная дзейнасць выступае як грамадская актыўнасць, якая праяўляецца ва ўсведамленні матывацыі, выбары сродкаў і спосабаў пазнання, крытычнай ацэнцы ўласных і чужых меркаванняў, адборы асабіста каштоўнага вучэбнага матэрыялу, здзяйсненні крытычна-творчага падыходу да праблем» [8, с. 275].

У падлеткавым узросце перш за ўсё працягвае развівацца тэарэтычнае мысленне, якое становіцца асновай для развіцця мыслення крытычнага. У падлеткаў праяўляецца здольнасць аперыраваць гіпотэзамі пры рашэнні інтэлектуальных задач. Пры гэтым падлетак імкнецца выкарыстаць розныя падыходы, знайсці сярод іх найбольш рацыянальны. Падлеткі схільныя да эксперыментавання, што праяўляецца ў нежаданні ўсё прымаць на веру, імкненні ўсё самастойна пераправерыць. Гэта стымулюе развіццё крытычнага мыслення [5]. Указаныя здольнасці развіваюцца не самі па сабе, а фарміруюцца ў працэсе школьнага навучання, пры авалоданні знакавымі сістэмамі, прынятымі ў сучаснай навуцы.

Асаблівасць развіцця крытычнага мыслення падлеткаў заключаецца і ў здольнасці аналізаваць абстрактныя ідэі, цікавасці да абстрактных філасофскіх праблем, у тым ліку палітычных, этычных, аналіз якіх патрабуе крытычнага мыслення. Падлеткі пачынаюць разважаць аб ідэалах, аб будучым, у іх фарміруецца глыбокі абагулены погляд на свет, адбываецца станаўленне светапогляду.

Сучасная педагагічная псіхалогія падкрэслівае, што ў падлеткавым узросце актыўна развіваюцца самасвядомасць, самаацэнка, на падставе чаго магчыма мэтанакіраванае самаўдасканаленне;

імкненне зацвердзіць сваю самастойнасць, неабходнасць самасцвярджэння [6].

Меркаванні падлеткаў часам носяць востры, катэгарычны характар, а пры аргументацыі ацэначных выказванняў характэрныя супярэчнасці паміж канкрэтным і абстрактным. Аднак паступова самаацэнка становіцца ўсё больш аб'ектыўнай і рэалістычнай, расце самакрытычнасць. Падлеткі задумваюцца пра магчымую суб'ектыўнасць уласных і чужых меркаванняў. Але большая частка дзяцей падлеткавага ўзросту мае цяжкасці ў вызначэнні магчымых варыянтаў, параўнанні іх паміж сабой, у ацэнцы па розных крытэрыях [3].

Неабходна мець на ўвазе, што імкненне да самастойнасці мыслення ў спалучэнні з небагатым жыццёвым вопытам, абмежаванасцю ведаў падлеткаў часам прыводзіць да схематызму і фармалізму, спроб мысліць гатовымі схемамі, няздольнасці ўлічваць змяненне абставін, да тэндэнцыі няправільна прымяняць засвоеныя правілы і прынцыпы да новых абставін.

Развіццё крытычнага мыслення ў падлеткаў можа пайсці па шляху фарміравання «аўціраванага крытыцызму», своеасаблівай схільнасці не столькі самастойна мысліць, колькі сумнявацца, пярэчыць, ставіць пытанні, адстойваць загадзя памылковыя пастулаты. Не імкненне да ісціны, а сам працэс «сутыкнення аргументацый» прываблівае падлетка. У такім выпадку настаўнік павінен тактоўна паказаць бессэнсоўнасць такіх спрэчак, дапамагчы ўбачыць іншае «поле прымянення» ўмення крытычна і самастойна мысліць.

Катэгарычнасць ацэнак, дэманстратыўны скепсіс падлетка часта прыводзіць да негатывізму, які пажадана прадухіліць.

Такім чынам, у падлеткавым узросце мысленне школьнікаў становіцца ўсе больш «адчувальным да супярэчнасцей, дыскурсіўным, імкнецца да доказнасці» [2, с. 43]. Гэты ўзрост з'яўляецца спрыяльным для развіцця крытычнага мыслення, бо падлеткі могуць мысліць лагічна, займацца тэарэтычнымі разважаннямі і самааналізам. Яны адносна свабодна разважаюць на маральныя, палітычныя і іншыя тэмы, практычна недаступныя інтэлекту малодшага школьніка. Важнейшы інтэлектуальны набытак падлеткавага ўзросту – гэта ўменне аперыраваць гіпотэзамі.

Да старэйшага школьнага ўзросту ў дзяцей фарміруецца тэарэтычнае (славесна-лагічнае) мысленне, назіраецца інтэлектуалізацыя пазнавальных працэсаў. Асабліва заўважным становіцца рост свядомасці і самасвядомасці, пашырэнне сферы ўсвядомленага, паглыбленне ведаў пра сябе, людзей, навакольны свет. Гатоўнасць падлеткаў да асабістага самавызначэння ўключае сістэму каштоўнасных арыентацый, развіццё форм тэарэтычнага мыслення, у тым ліку крытычнага.

## Эксперымент

Намі было праведзена даследаванне, накіраванае на вывучэнне асаблівасцей развіцця ў школьнікаў крытычнага мыслення (на ўроках беларускай мовы і літаратуры), шляхоў і сродкаў арганізацыі гэтага працэсу. Эксперымент праводзіўся на базе гімназіі № 3 г. Баранавічы ў 7–8 класах. У эксперыментальнай групе было 40 вучняў, у кантрольнай – 80 (усяго 120 чал.).

Паколькі «інфармацыя з'яўляецца адпраўным пунктам развіцця крытычнага мыслення», а «веды ствараюць матывацыю, без якой чалавек не можа мысліць крытычна» [5, с. 83], крытычнае мысленне і ўзровень ведаў, уменняў і навыкаў узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. З мэтай выяўлення ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове і літаратуры вучням быў прапанаваны комплексны тэст.

Для вызначэння ўзроўню развіцця крытычнага мыслення мы выкарысталі заданні, якія натуральна ўпісваліся ў вучэбны працэс, раней былі знаёмыя вучням, маглі б поўна і наглядна прадэманстраваць асобасныя якасці ўзроўню развіцця крытычнага мыслення.

Пасля вывучэння адпаведных літаратурных твораў у кантрольным і эксперыментальным класах праводзіліся дыскусіі «Трэба дома бываць часцей» (В. Карамазаў «Дзяльба кабанчыка»), «Простае шчасце людское» (М. Танк «Шчасце»), «Чалавеку патрэбна не слава» (С. Грахоўскі «Чалавеку патрэбна не слава»). Нягледзячы на тое што па прычыне высокай эмацыянальнасці складана зафіксаваць рэакцыі школьнікаў, нам прадставілася магчымасць выявіць няздольнасць вучняў весці лагічны дыялог (70%), задаваць пытанні розных тыпаў (50%), устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі (65%), правільна аргументаваць свой пункт погляду, прымяняць знаёмую інфармацыю да розных жыццёвых сітуацый (60%).

Заданні напісаць сачыненне-разважанне (пісьмовае выказванне) на вызначаную тэму («Маё месца пад сонцам», «Што значыць быць Чалавекам» і інш.), звязаныя з пісьмовай мовай і накіраваныя на арганізацыю і ініцыіраванне працэсу крытычнага мыслення, паслужылі матэрыялам для дыягностыкі асобасных якасцей і ўзроўню развіцця крытычнага мыслення.

Мы звярнулі ўвагу на аднастайнасць інтэрпрэтацый і ацэнак вывучаемага матэрыялу (60% школьнікаў), 50% вучняў не змаглі дакладна сфармуляваць гіпотэзы, абазначыць праблемы, 55% – дапускалі атаясамліванне паняццяў, галоўных і другасных тэм.

Асноўную прычыну мы бачым у недастаткова развітой здольнасці крытычна мысліць, несфарміраванасці ўстановак на крытычнае мысленне.

З мэтай прасачыць магчымасць развіцця крытычнага мыслення падлеткаў намі былі праведзены ўрокі беларускай мовы і літаратуры ў вышэйназваных навучальных установах.

Урокі былі накіраваны на тое, каб вучэбны матэрыял засвойваўся не падчас рэпрадуктыўнай дзейнасці, а пры актыўным удзеле вучняў. Школьнікі мелі магчымасць праяўляць свае творчыя здольнасці, індывідуальныя якасці, удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў, абараняць свой пункт погляду, праводзіць невялікія даследаванні. Шмат увагі надавалася самастойнай дзейнасці вучняў, развіццю іх умення пераадольваць цяжкасці, якія ўзнікаюць у вучэбнай рабоце. Заданні павышанай складанасці прадугледжвалі прымяненне праблемна-пошукавага падыходу, самастойную працу, устанаўленне вучнямі асацыятыўных сувязей. Групавыя, парныя і індывідуальныя формы работы давалі магчымасць настаўніку ствараць на ўроках спрыяльны псіхалагічны клімат, вучням – рэалізоўваць свае асобасныя якасці, інтэлектуальныя магчымасці, творчыя здольнасці. Работа на кожным уроку была арганізавана па схеме: стадыя выкліку – стадыя асэнсавання – стадыя рэфлексіі.

У той час, калі ў эксперыментальным класе навучанне вялося адпаведна распрацаванай мадэлі развіцця крытычнага мыслення падлеткаў і выкарыстоўвалася сістэма ўрокаў, якая ўключала актыўныя формы, метады і прыёмы работы, у кантрольных класах урокі беларускай мовы і літаратуры праводзіліся традыцыйна.

Назіранне дало магчымасць устанавіць, што часцей за ўсё на гэтых уроках працавалі адны і тыя ж вучні, аналіз твораў звычайна зводзіўся да пераказу сюжэта, а праца на ўроках мовы – да завучвання правіла.

Кантрольная праверка вынікаў эксперымента праводзілася праз розныя віды апытання, тэсціраванне, а таксама шляхам аналізу творчых работ вучняў: эсэ, лінгвістычны аналіз паэтычных тэкстаў, складанне псіхалагічнага партрэта лірычнага героя, кластар, двайныя дзённікі, сінквейн і г. д.

Аналіз пісьмовых работ вучняў кантрольнага і эксперыментальнага класаў паказаў, што ўспрыманне вучэбнай інфармацыі ў вучняў кантрольнага класа знаходзіцца на тым жа ўзроўні, што і на этапе канстатуючага эксперымента. У эксперыментальным класе адзначылася праяўленне вучнямі некаторых якасцей крытычнага мыслення. Работы прыкладна 65% вучняў вылучаліся эмацыянальнаи чуинасцю, аргументаванасцю, рэфлексіўнасцю, выражанымі асобаснымі адносінамі да матэрыялу, які аналізаваўся, імкненнем устанавіць сувязь з жыццём. 50% падлеткаў актыўна выкарыстоўвалі ў працэсе аналізу твора атрыманыя тэарэтыка-літаратурныя і гісторыка-культурныя веды, 70% вучняў імкнуліся глыбока і поўна аналізаваць вучэбны матэрыял. Работы вучняў кантрольнага класа адрозніваліся несамастойнасцю, аднатыпнасцю, бяздоказнасцю ацэнак, толькі 22% школьнікаў у сваіх работах самастойна рабілі вывады ў працэсе разважанняў, імкнуліся выказаць сваё меркаванне. Вучні кантрольных класаў (як і раней) не ўмелі аналізаваць і тлумачыць прычыны з'яўлення памылак, аргументавана даказваць свой пункт погляду, былі катэгарычнымі ў сваіх негатыўных ацэнках. У вучняў эксперыментальных класаў паменшылася колькасць лагічных памылак, што, безумоўна, з'яўляецца вынікам развіцця крытычнага мыслення; важна адзначыць, што большасць работ падлеткаў набыла характар разгорнутых крытычных меркаванняў, ацэнкі былі канкрэтнымі, аб'ектыўнымі, абгрунтаванымі.

У эксперыментальных класах сітуацыя палемікі, групавой дыскусіі стала звычайнай. Колькасць вучняў, якія ўдзельнічалі ў палеміцы ў кантрольных класах, не перавышала 60%, а ў эксперыментальных складала 95%.

Намі адзначаны арыгінальнасць і аргументаванасць сцверджанняў, высокі ўзровень уменняў прымяняць агульныя веды да канкрэтных умоў, выдзяляць галоўнае, ацэньваць інфармацыю, фармуляваць пытанні розных тыпаў у 50% вучняў эксперыментальных класаў і 15% вучняў кантрольных класаў.

З улікам вынікаў назірання, аналізу пісьмовых работ, тэсціравання, абапіраючыся на распрацаваную сістэму ацэнкі ўзроўняў развіцця крытычнага мыслення падлеткаў мы запоўнілі тэст-карту якасцей асобы, якая мысліць крытычна (якасці: самастойнасць, эўрыстычнасць, аб'ектыўнасць, аргументаванасць, лагічнасць, камунікатыўнасць, дыялагічнасць, рэфлексіўнасць).

Для доказнасці змены ва ўзроўнях якасцей крытычнага мыслення быў выкарыстаны метад «G – крытэрый знакаў».

На падставе падліку сярэдняй арыфметычнай велічыні паказчыка якасцей асобы, якая мысліць крытычна, мы прасачылі наступную дынаміку развіцця крытычнага мыслення падлеткаў:

| | Узроўні развіцця крытычнага мыслення | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | высокі | | сярэдні | | нізкі | |
| | Экспер. клас | Кантр. клас | Экспер. клас | Кантр. клас | Экспер. клас | Кантр. клас |
| | % | % | % | % | % | % |
| У пачатку эксперымента | 12, 5 | 10 | 40 | 42,5 | 47,5 | 47,5 |
| У канцы эксперымента | 25 | 7,5 | 60 | 45 | 15 | 47,5 |

У эксперыментальным класе назіраецца станоўчая дынаміка росту ўзроўню крытычнага мыслення. У кантрольным класе колькасны паказчык узроўню крытычнага мыслення падлеткаў не змяніўся.

Такім чынам, у працэсе эксперыментальнага навучання выяўлена станоўчая дынаміка ў развіцці крытычнага мыслення вучняў і прама прапарцыянальная яе залежнасць ад узроўню засваення ведаў, уменняў і навыкаў. Калі да правядзення эксперыменту высокі ўзровень крытычнага мыслення вучняў у эксперыментальных класах складаў 12,5%, то пасля эксперыменту дадзены паказчык узрос да 25%; адпаведна ўзрос і паказчык ведаў, уменняў і навыкаў. Вынікі праведзенага даследавання сведчаць аб эфектыўнасці распрацаванай мадэлі развіцця крытычнага мыслення падлеткаў.


## Рэзюмэ аўтараў

Для развіцця патэнцыяльных здольнасцей падлеткаў да крытычнага мыслення неабходна выкананне педагогам пэўных псіхолага-педагагічных умоў: стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага мікраклімату на занятках, улік асобасных, індывідуальных асаблівасцей падлеткаў, уключэнне ў адукацыйны працэс суб'ектыўнага вопыту школьнікаў. Вялікае значэнне мае сфарміраванасць у педагога матывацыйна-аксіялагічных адносін да развіцця крытычнага мыслення, абмен вопытам даследчыкаў і педагогаў па пытаннях фарміравання і развіцця крытычнага мыслення.

Крытычнае мысленне не з'яўляецца аўтаматычна. Каб дасягнуць пажаданага эфекту, трэба прыкладваць сістэматычныя намаганні для яго фарміравання і развіцця.


## ЛІТАРАТУРА


1. **Блонский, П. П.** Память и мышление / П. П. Блонский // Избр. педагог. и психол. соч.: в 2 т. – М., 1979.
2. **Боно, Э. Д.** Учите вашего ребенка мыслить / Э. Д. Боно. – СПб.: Скифия, 1998. – 316 с.
3. **Волков, Б. С.** Психология подростка: учебное пособие / Б. С. Волков. – М.: Академический проект: Гаудеамус, 2005. – 203 с.
4. **Кон, И. С.** Психология юношеского возраста: проблемы формирования личности: учеб. пособ. для пед. ин-тов / И. С. Кон. – М.: Просвещение, 1979. – 175 с.
5. **Мухина, В. С.** Возрастная психология: феноменология развития, детство, отрочество: учеб. для студ. вузов / В. С. Мухина. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Издательский центр «Академия», 1998. – 436 с.
6. **Немов, Р. С.** Психология: учеб. для студ. высш. пед. учеб. заведений. Кн. 2. Психология образования / Р. С. Немов. – М.: Просвещение: Владос, 1984. – 496 с.
7. **Пиаже, Ж.** Избранные психологические труды / Ж. Пиаже // Психология интеллекта. – М.: МПА, 1969. – 94 с.
8. **Фельдштейн, Д. И.** Психология развивающейся личности / Д. И. Фельдштейн. – М. – Воронеж: Педагогика, 1996. – 224 с.
9. **Штерн, В.** Одаренность детей и подростков и методы исследования / В. Штерн. – М.: Наука, 1926. – 93 с.


## Рэдакцыйны каментарый

**Паважаныя чытачы!**

Працягваючы размову пра асаблівасці развіцця крытычнага мыслення школьнікаў, прапануем вам практычныя матэрыялы, дасланыя нашымі аўтарамі: **І. П. Байковай** (урок беларускай літаратуры), **Ж. С. Карповіч** (урок хіміі), **Е. А. Садоўскай, В. А. Сікорскай** (урокі англійскай мовы), **А. У. Сіўко** (урок беларускай мовы), **Д. С. Хамутоўскім** (урок фізікі). Спадзяёмся, вам цікава будзе пазнаёміцца і з метадычным праектам **А. В. Зубровай**: настаўніца гісторыі прадстаўляе вопыт сваёй работы па развіцці крытычнага мыслення вучняў на аснове даследчай дзейнасці. У матэрыялах настаўніцы рускай мовы і літаратуры **Л. П. Раманенка** вы знойдзеце карысныя парады па выкарыстанні некаторых прыёмаў, накіраваных на актывізацыю мыслення школьнікаў, развіццё іх творчых здольнасцей, а таксама сцэнарыі ўрокаў рускай літаратуры з элементамі тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо.

**Усе гэтыя матэрыялы размешчаны на сайце часопіса «Народная асвета» www.n-asveta.by/dadatki/metod_dadatak.pdf**

***В. А. Валатоўская,***
***рэдактар аддзела – член рэдкалегіі***